**Справаздача**
**па дзейнасці Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце**
«Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў» дзяржаўнай установы адукацыі
«Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г.Мінска»
**за 2023-2024 навучальны год**

Гарадскі рэсурсны цэнтр па выхаваўчай рабоце «Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў» – гэта трансляцыя і распаўсюджванне эфектыўнага педагагічнага вопыту работы па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню школьнікаў, студэнтаў і працоўнай моладзі, а таксама актывізацыя дзейнасці творчых калектываў Кастрычніцкага раёна і горада Мінска сродкамі розных відаў традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў.

Штогод у межах гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце рэалізоўвацца сістэмаўтваральныя праекты і конкурсы, у 2023-2024 навучальным годзе былі рэалізаваны наступныя мерапрыемствы: Дэкада беларускай мовы і культуры (19.02-28.02.2024); VII адкрыты конкурс беларускіх народных танцаў “Ветразь-2024” (18.04.2024); IV адкрыты конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы “Кацігарошак” (25.01.2024); цыкл каляндарна-абрадавых мерапрыемстваў (свята Дажынкі – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17303; Свята “Багатнік” – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17323; Пазнавальна-гульнёвая праграма “Прыйшоў Багач – кідай рагач” – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17343; Пазнавальная праграма “Восеньскія Кузьмінкі” – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17353; Пазнавальная праграма “Дзяды” – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17403; свята “Тры Каралі” – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17823; Пазнавальна-гульнёвая праграма “Провады Каляд” –http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18013; Раённае свята Масленіца – http://oktcvr.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=72803; Мерапрыемства “Даравальная нядзеля” – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18583; пазнавальна-гульнёвая праграма “Гуканне вясны” – http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18653; Пазнавальна-гульнёвая праграма “Вялічка” - http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18953 ).

Трэба адзначыць, што 2023-2024 навучальным годзе наш Гарадскі рэсурсны цэнтр па выхаваўчай рабоце праводзіў работу па развіццю узаемадзеяння з іншымі гарадскімі рэсурснымі цэнтрамі. Так для удзельнікаў МГААЦ “Лідер” былі праведзены тэматычныя мерапрыемствы: 13.12.2023 медыяазбука “Мая Беларусь”; 12.04.2024 «Искусство китайской каллиграфии». Акрамя гэтага педагогі і спецыялісты цэнтра “Ветразь” прымалі ўдзел у разнастайных мерапрыемствах іншых гарадскіх рэсурсных цэнтрах.

1. **Знакавымі мерапрыемствамі ў дзейнасці гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце.**

❖ *Семінар-практыкум «Інавацыйны падыход да вывучэння роднай мовы і культуры»* адбыўся 2 лістапада 2023 года для настаўнікаў гісторыі, беларускай мовы і літаратуры г.Мінска. Касцяневіч Н.У., загадчык аддзяленнем народнай творчасці цэнтра «Ветразь», кіраўнік рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце распавяла ўдзельнікам мерапрыемства пра дзейнасць гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце, план работы на 2023/2024 навучальны год. Яна засяродзіла ўвагу на палажэнні IV адкрытага конкурсу апавядальнікаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак».

Затым для гасцей семінара выступіла Казакова Зоя, удзельніца фальклорнага калектыву “Мілавіца”, якая распявала беларускую народную казку “Як мужык гусей дзяліў”.

Кульбіцкая Вольга, культарганізатар, прэзентавала новую праектна-даследчую гульню «Гісторыя на далонях», пазнаёміла з арганізацыйнымі этапамі гульні.

Па заканчэнні мерапрыемства ўдзельнікі наведалі аглядную экскурсію на тэму «Беларуская хатка: захоўваем традыцыі», дзе пазнаёміліся з інтэр’ерам беларускай хаты і прадметамі льноапрацоўкі. Мерапрыемства наведала – *32 чалавека.* http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17453

❖ *Декада роднай мовы і культуры «Родная мова – люстэрка народа»*, якая адбылася з 19 па 28 лютага 2024 года (адказны – Касцяневіч Н.У., загадчык аддзяленнем народнай творчасці).

19 лютага ЦДАДіМ “Ветразь” г.Мінска распачаў дэкаду роднай мовы і культуры *адкрытай метадычнай пляцоўкай “Вопыт: жывая ніць традыцый”.*

Цэнтр “Ветразь” пазнаёміў гасцей мерапрыемства з накірункам і вынікамі дзейнасці гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце. Таксама можна было пачуць а вопыце работы запрошанных гасцей з ўстаноў адукацыі горада Мінска: ДУА “Гімназія 35 г.Мінска ім. Я.І. Міркоўскага”, ЦДАДіМ “Маяк” г.Мінска, ЦТіМТДіМ Фрунзенскага раёна г.Мінска “Зорка”, МДТЭЦДіМ, УА “Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж ім. А.К. Глебава”.

На мерапрыемстве прысутнічалі кіраўнікі гарадскіх рэсурсных цэнтраў, удзельнікі інавацыйных праектаў, а таксама зацікаўленыя асобы. *http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18303* Наведала 38 чалавек.

Яскравымі мерапрыемствамі тэматычнай дэкады сталі:

Гульня-розыгрыш у сацыяльнай сетцы Instagram *“Цішотка”*, мерапрыемства дадзенага фармата дае магчымасць прыцягнуць рознаузроставую катэгорыю ўдзельнікаў, пашырыць аўдыторыю.

22 лютага 2024 года адбыўся *ІІІ адкрыты конкурс чытальнікаў беларускай паэзіі «Магутнае слова, ты, роднае слова»*, у конкурсе прынялі ўдзел навучэнцы з устаноў адукацыі Кастрычніцкага, Заводскога,

Фрундзенскага раёнаў г.Мінска. (прысутнічала – 66 чалавек.) http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18353 ;

24 лютага адбылася *канцэртная праграма "Беларусь у маім сэрцы",* якая прайшла ў рамках дэкады беларускай мовы і культуры "Родная мова – люстэрка народа!". Аб'яднанні па інтарэсах мастацкага профілю прадставілі свае творчыя нумары. Песні на беларускай мове, танцы пад музыку беларускіх кампазітараў і інструментальныя творы, а таксама вершы беларускіх паэтаў. http://oktcvr.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=72123 Наведала 27 чалавек.

Інтэрактыўная пляцоўка *"Ад роднай мовы да мовы танцаў"* Удзельнікі фальклорнага калектыву "Скарбніца традыцый" (кіраўнік – Хамутова І.В.) арганізавалі інтэрактыўную пляцоўку для студэнтаў-практыкантаў кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКіМ, дзе паказалі традыцыйныя танцы з прыпеўкамі, а таксама валоданне майстэрствам апавядання беларускай народнай прозы. http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18463 Наведала 32 чалавека.

28 лютага 2024 года – *V адкрыты чэмпіянат па інтэлектуальнай гульне «Беларускі КВІЗ»*, дзе прынялі ўдзел каманды з розных устаноў адукацыі г.Мінска, а менавіта: СШ 10, 30, 62, 71, 110, 168, гімназіі 5, 56, ЦДАДіМ "Ранак" і "Эўрыка" г.Мінска. (прысутнічала – 83 чалавека) http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18413

Такім чынам, у межах дэкады роднай мовы і культуры "Родная мова – люстэрка народа!" было праведзена 31 мерапрыемства, прыняла ўдзел больш за *550 чалавек,* гэта навучэнцы, моладзь, бацькі, педагогі і спецыялісты розных устаноў адукацыі.

❖ *II раённая інтэлектуальная гульня "Беларускі асілак"*, праходзіла ў 2 этапы: медыяаазбука "Ад А да Я" і "Поле цудаў", задачамі якіх было актуалізацыя ведаў дзяцей пра Беларусь і родную мову, а таксама выхаванне пачуцця патрыятызму і гонару за сваю Радзіму. Колькасць удзельнікаў – *36 чалавек.* http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17723, http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18933.

❖ *Культурна-выхаваўчая праграма "Культурнае багацце беларусікаў ад А да Я".* Галоўнай мэтай праграмы з'яўляецца знаёмства дзяцей з беларускімі народнымі традыцыямі, музыкай і забавамі праз фарміраванне культурных каштоўнасцей роднага краю сродкамі арганізацыі пазнавальна-гульнёвай дзейнасці. За 2023-2024 навучальны год прайшло 4 праграмы, у якіх прынялі ўдзел *48 навучэнцаў* 4-7 класаў устаноў адукацыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска.

❖ *Праектна-даследчая гульня "Гісторыя на далонях",* якая праходзіла ў 4 этапы: "Мае карані – мая сіла" (даследчы этап), "Па сцежкам мінулага" (творчы этап), "Час у маіх далонях" (мастацкі этап) і "Гісторыя – мой гонар" (інтэлектуальны этап). Задачамі гульні з'яўлялася развіццё

праектнай дзейнасці як адной з вядучых форм дзейнасці дзяцей, павышэнне інтэлектуальнага ўзроўню навучэнцаў і развіццё творчага мыслення. Колькасць удзельнікаў – *24 чалавека.*
http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17493,
http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18613

❖ *Святочны канцэрт "Берагіня фальклорнага калектыву "Мілавіца".* 28 кастрычніка 2023 года адбыўся святочны канцэрт "Берагіня фальклорнага калектыву "Мілавіца" прысвечаны памяці і 70-годдзю са дня нараджэння Марыі Снітко, які сабраў разнастаныя калектывы з розных устаноў г.Мінска, а менавіта: тэатр танца "Чарли" (кіраўнік – Пашковская В.В.), тэатр моды "Домино" (кіраўнік – Рачыцкая В.У.), фальклорны гурт "Страла" (кіраўнік – Шчадрына Э.В., ансамбль казачнай песні "Радня", спеўны квартэт "Белая ружа", артысты Нацыянальнага акадэмічнага народнага хора Рэспублікі Беларусь імя Г. і. Цітовіча і канешне выпускнікоў фальклорнага калектыву "Мілавіца". *Прысутнічала 140 чалавек.* http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17413

❖ Асобна трэба адзначыць супрацоўніцтва з кафедрай народна-песеннай творчасці і фальклору БДУКіМ. Сумесна ладзяцца абрадавыя і метадычныя мерапрыемствы, такія як *свята Стрэчанне,* паводле традыцыі в.Пласток Любанскага раёна. *Прысутнічала 36 чалавек.* http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18183

## 2. Сістэмаўтваральныя конкурсы ГРЦ цэнтра "Ветразь".

❖ *IV адкрыты конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы "Кацігарошак".* Конкурс апавядальнікаў сабраў больш за 35 удзельнікаў з розных устаноў адукацыі горада Мінска, а таксама з аг. Сеніцы, Слуцкага і Барысаўскага раёнаў.

Для ўдзельнікаў і гасцей конкурсу выступаў узорны фальклорны ансамбль "Калыханка" (кіраўнік – Рыжкова Л.М.) Міханавіцкага філіяла Мінскага раённага цэнтра культуры, які прадэманстраваў некалькі фрагментаў песенек па тэме і сюжэтах беларускіх народных казак. http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17913 *(На мерапрыемстве прысутнічала 65 чалавек).*

❖ *VII адкрыты конкурс беларускіх народных танцаў «Ветразь-2024».* 18 красавіка 2024 года ў ДУА «Сярэдняя школа №1 г.Мінска імя В.П. Чкалава» (вул. Чкалава, 3а) сабраліся 10 калектываў з розных рэгіёнаў Беларусі для таго, каб падзяліцца лакальнымі асаблівасцямі валодання народнымі танцамі на чарговым, VII адкрытым конкурсе беларускіх народных танцаў «Ветразь – 2024». *Наведала – 265 чалавек.*

http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18853

## 3. УЗРОВЕНЬ ПРАВЕДЗЕНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

Дзейнасць Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце цэнтра “Ветразь” ў 2023-2024 навучальным годзе – гэта шырокая рэалізацыя мерапрыемстваў markрознага ўзроўню і фармату:

*рэгіянальны узровень (Кастрычніцкі раён):*

- Праектна-даследчая гульня “Гісторыя на далонях”
- Культурна-выхаваўчая праграма “Культурнае багацце беларусікаў ад А да Я”
- II раённая інтэлектуальная гульня “Беларускі асілак”
- Раённы этап адкрытага гарадскога конкурсу майстроў мастацтва выразання з паперы “Сняжынка-2023” (*15 чалавек*)
- Мерапрыемствы каляндарна-абрадавага цыкла (свята Дажынкі, свята “Багатнік”, пазнавальна-гульнёвая праграма “Прыйшоў Багач – кідай рагач”, пазнавальная праграма “Восеньскія Кузьмінкі”, пазнавальная праграма “Дзяды”, свята “Тры Каралі”, пазнавальна-гульнёвая праграма “Провады Каляд”, раённае свята Масленіца, мерапрыемства “Даравальная нядзеля”, пазнавальна-гульнёвая праграма “Гуканне вясны”, пазнавальна-гульнёвая праграма “Вялічка”) *Наведала – 178 чалавек.*
- Творчая пляцоўка “Час навагодніх цудаў” у рамках акцыі “Нашы дзеці” для шматдзетных дзяцей Кастрычніцкага раёна (*21 чалвек*).
- Інтэрактыўная экскурсія “Беларускі лён” для навучэнцаў устаноў адукацыі Кастрычніцкага раёна (*45 чалавек*).
-

*гарадскі узровень (г.Мінск):*

- Семінар-практыкум «Інавацыйны падыход да вывучэння роднай мовы і культуры»
- Інтэрактыўная пляцоўка «Беларускія забавы» у рамках II адкрытага свята «Творчество рождает радость» (*158 чалавек*).
- Адкрытая метадычная пляцоўка “Вопыт: жывая ніць традыцый”
- III адкрыты конкурс чытальнікаў беларускай паэзіі «Магутнае слова, ты, роднае слова»
- V адкрыты чэмпіянат па інтэлектуальнай гульне «Беларускі КВІЗ»
- Інтэрактыўная праграма «Як пайшла Каляда» для замежных студэнтаў БДУ (*34 чалавека*).

*Рэспубліканскі:*

- IV Адкрыты конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы «*Кацігарошак».*
- VII адкрыты конкурс выканаўцаў беларускіх народных танцаў *«Ветразь-2024».*

**4. Супрацоўніцтва з нашымі партнёрамі:**

- ДУА «Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі»;
- ДУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»;

- УА «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;
- УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт»;
- УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва»;
- УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.Танка»;
- Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту;
- УА «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі»;
- Дзяржаўныя ўстановы адукацыі Кастрычніцкага раёна г.Мінска.

**5. Трансляцыя вопыту Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце ў 2023-2024 навучальным годзе:**

- Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Вызовы современности и стратегии развития дополнительного образования детей и молодежи в условиях современной реальности». http://oktcvr.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=68513
- IX рэспубліканскі конкурс на лепшы праект па арганізацыі шостага школьнага дня, адзначаны на горадзе III месцам.
- Анлайн-прэзентацыя рэгіянальных практык «Учреждение дополнительного образования детей и молодежи – территория воспитания и творчества».
- Прэзентацыя выставы “Адзінства беларускага народа ў культуры і традыцыях” (14.09.23 Гарадскі дом культуры, 16.09.23 Гарадская Ратуша, 20.10.23 ГЦ “Сталіца”)
- Гарадская выстава “Хвалите имя Господне”. http://oktcvr.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=68773
- Заключныя мерапрыемствы III Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу даследчых праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый”, прысвечаныя Году міру і стварэння. Праца адзначана дыпломам удзельніка Міністэрства адукацыі РБ. http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17543
- Выстава «Дакрануцца душой да спадчыны» у межах 20-годдзя Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай спадчыны пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=17383
- Анлайн лекцыя “Беларускі танец” https://www.instagram.com/reel/C0tXPKlNgmv/?igsh=MXdkZXU4cW41ZDNqNw
- Мінскі гарадскі фестываль народнай творчасці “Сузор’е”, на горадзе адзначаны працы аб’яднанняў па інтарэсах “Чароўная саломінка” (ПДА – Таляронак А.А.) дыпломам лаурэата і “Кераміка” (ПДА – Календа В.А.) дыпломам 2 ступені.

- Гарадская выстава-конкурс творчых работ “Зімовыя мроі”, адзначаны на горадзе 1 месцам АІ “Чароўная саломінка” (ПДА – Таляронак А.А.) у намінацыі “Елочная игрушка “Соломенное чудо”
- Рэспубліканская выстава-конкурс майстроў народнай творчасці
- Гарадскі конкурс “Образовательная цифра – 2023” http://oktcvr.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=69593
- Рэспубліканская выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў “Калядная зорка”, на Рэспубліцы адзначаны дыпломам 1 ступені аб’яднанне па інтарэсах “Чароўная саломінка” (ПДА – Таляронак А.А.)
- Свята беларускай народнай песні і музыкі “Карагод сяброў”
- Метадычная лекцыя па вясновым беларускім народным святам “Вясна красна на ўвесь свет” для грамадскай арганізацыі культурна-асветніцкага аб’яднання беларусаў у Іарданіі у рамках супрацоўніцтва з міжнародным інтэрактыўным дзіцяча-юнацкім анлайн-клубам “Территория шести рукопожатий”. https://www.facebook.com/100081537422901/posts/pfbid0tLcXRsfAtbtCk9BKPECBKRx1ZHvLnVvBzYF7wUxHEvopSVgQkz7kCq6QCXcbWnmal/?app=fbl .
- Раённы этап конкурсу “Лучшие практики и методические инструментарии в патриотическом воспитании”, адзначаны дыпломам 1 ступені.
- IV Рэспубліканскі педагагічны форум «Патрыятычнае выхаванне навучэнцаў праз стварэнне этнакультурнага асяроддзя: педагагічны вопыт і выхаваўчыя практыкі ў сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі», быў падрыхтаваны артыкул “Вялікодная традыцыя ў вялікім горадзе на прыкладзе фальклорнага калектыву “Мілавіца”.
- Адкрытыя міжнародныя краязнаўчыя чытанні навучэнцаў і педагагічных работнікаў устаноў адукацыі “Гістарычная памяць народа: з мінулага да будучыні”. http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18883
- Прэзентацыя навукова-папулярнага выдання “Легенды і былічкі” з серыі “Фальклорныя скарбы беларусаў” у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=19063

З мэтай абагульнення і распаўсюджвання педагагічнага вопыту па дзейнасці РЦ функцыянуе тэматычны сайт «Традыцыйная культура і моладзь» http://tk.oktcvr.minsk.edu.by, вядуцца старонкі (акаўнты) ў Instagram @vetraz_official, @folkkalektyu_milavica, @skarbnica_tradycyj, Telegram-канале «Ветразь» – для ўсіх, «Ветразь» – для кожнага» і YouTube – канал «Ветразь», дзе кожны можа паглядзець прамыя эфіры семінараў і абрадаў, а таксама выкарыстоўваць матэрыялы відэазаняткаў для арганізацыі

навучальнага працэсу і выхаваўчых мерапрыемстваў у сваёй педагагічнай дзейнасці.

У перыяд 2023-2024 навучальнага года была падрыхтавана віртуальная экскурсія “Апрацоўка лёну”, дадзены відэаматэрыял быў прадстаўлены на Гарадскім конкурсе «Образовательная цифра-2023» у намінацыі «Віртуальная экскурсія», вынік – *3 месца*. З матэрыялам можна пазнаёміцца па спасылцы: https://www.youtube.com/watch?v=pz85EhCrex8 .

Трэба адзначыць, што дзейнасць рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце асвятляецца ў СМІ:

| **№** | **Найменне артыкула** | **П.І.І.п.Б педагога-аўтара** | **Назва часопіса, газеты, (№ часопіса), сайта** (спасылка на сайт) |
|---|---|---|---|
| **1.** | *II адкрыты фолькфэст народнай творчасці “Ляльнік”* | *Касцяневіч Н. У., Кульбіцкая В. А.* | Мастацкая рэканструкцыя і аднаўленне элементаў этнакультуры ў дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах фальклорнага і дэкаратыўна-прыкладнога кірункаў: вопыт і вынікі: адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы : у 2 ч. / склад. Т. М. Крыўко. – Мінск : НЦМТДМ, 2023. – Ч. 1. – 166 с. **(102 с.)** https://drive.google.com/file/d/1rDqvvJ_pb_3ibvhLFgAQ29xts_egYw9b/view |
| 2. | *У казцы душа роднай мовы* | Давала інтэрв’ю **Касцяневіч Надзея** | Минская школа сегодня (№2, 2024) https://msh.aiv.by/ru/zhurnal/novosti/u-kaztsy-dusha-rodnaj-movy.html |
| 3. | *«Конкурс беларускіх народных танцаў «Ветразь-2024» прайшоў у Мінску»* | | Республиканская газета для детей и подростков “Зорька” http://www.zorika.by/?p=87421 |
| 4. | *Тэатральная кібітка: кола часу. Рэканструкцыя народных абрадаў у аздараўленчым летніку* | **Вольга Аляксандраўна Кульбіцкая,** культарганізатар | Навукова-метадычны часопіс «Выхаванне і дадатковая адукацыя», №5, 2024 |
| 5. | | Педагог дадатковай адукацыі **Рубчэня Надзея Ціханаўна,** навучэнцы аб’яднання па | Часопіс для дзяцей і іх бацькоў «Качели» |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | інтарэсах “Народный клуб художников” | |

| № | Педагог(і), дзіцячы калектыў | Найменне радыё і тэлевізійнай перадачы | Тэма сюжэта |
|---|---|---|---|
| **2023-2024 вучэбны год** | | | |
| 1 | Касцяневіч Н.У., фальклорны калектыў “Мілавіца” | Тэлерадыёкампанія Беларусь 3 праграма “Наперад у мінулае” | Рэканструкцыя вясельнага абраду “Выкуп нявесты” https://www.youtube.com/watch?v=C95CtYWP71I |
| 2 | Касцяневіч Н.У., ПДА | Канал «Культура». Проект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» *(31.01.2024)* | Праца фальклорнага калектыва “Мілавіца” http://tk.oktcvr.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=18063 |
| 3 | Таляронак А.А., ПДА | Тэлеканал СТВ Телепередача «Минск и минчане» за 20.01.2024 https://www.youtube.com/@CTVBYvideo | Удзел у XXVI рэспубліканскай выставе-конкурсе дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў «Калядная зорка» |
| 4 | Рубчэня Н.Ц., ПДА | Канал «Культура». Проект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» (28.02.2024) | Творчая дзейнасць аб’яднання па інтарэсах “Народный клуб юных художников” http://oktcvr.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=72443 |

Такім чынам, практычная і дзейсная рэалізацыя мерапрыемстваў Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце «Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў» спрыяе фарміраванню грамадзянскіх і патрыятычных якасцяў, самаўдасканаленне ў кірунку «традыцыйная народная культура беларусаў» як падрастаючага пакалення, так і педагогаў, законных прадстаўнікоў навучэнцаў.

На працягу 2023-2024 навучальнага года ў мерапрыемствах рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце прыняла ўдзел – ***1647 чалавек***.

Загадчык аддзяленнем
народнай творчасці цэнтра «Ветразь»,
кіраўнік рэсурснага цэнтра
па выхаваўчай рабоце Н.У Касцяневіч